Падтрымай "Вясну" на PATREON

Чыноўнікі спалохаліся пратэсту насельніцтва і запусцілі рухавік пераследу

07.03.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, акцыі, пераслед, свабода мірных сходаў



Марш недармаедаў у Берасці. Фота: ПЦ "Вясна"

Улады Беларусі паспешліва спрабуюць знізіць сацыяльную актыўнасць насельніцтва, звязаную з прымяненнем Дэкрэта №3 аб сацыяльным утрыманстве. Дзеля гэтага выкарыстоўваюцца самыя разнастайныя метады: запалохванні і папярэджанні, штрафы і арышты, змяшчэнне ў псіхіятрычную лякарню, затрыманні і ператрусы.

Берасце. 6 сакавіка адміністрацыйнымі арыштамі ад 4 да 5 сутак былі пакараныя чацвёра прадстаўнікоў анархічнага руху, якія бралі ўдзел у маршы недармаедаў 5 сакавіка. У суд іх прывезлі пасля 17 гадзін і судзілі аж да 20-30, каб менш народу магло паўдзельнічаць у судовых працэсах. У

гэты дзень за ўдзел Маршы актывіста **Андрэя Шарэнду** аштрафавалі на 25 базавых велічыняў (575 рублёў). Суд над актывістам з Бярозы **Аляксандрам Кабанавым** перанесены на 9 сакавіка. Паведамляе Тамара Шчапёткіна з Бярозы:

> *"Аляксандр Кабанаў толькі ў 19 гадзін быў адпушчаны на волю да чацвярга, 9 сакавіка. Яго будуць судзіць а 16 гадзіне адразу па двух справах. Трымалі суткі да суда ў ІЧУ Бярозаўскага РАУС у таямніцы. Тэлефон яго адразу забралі. Перанеслі суд ў сувязі з хадайніцтвам ад абаронцы аб азнаямленнем са справай. Першая справа - хуліганства, другая - арганізацыя і ўдзел у Маршы недармаедаў у Берасці".*

Гродна. Працягваецца пераслед гарадзенскіх удзельнікаў акцыі супраць дэкрэта № 3, якая адбылася 19 лютага. На актывістку БХД **Галіну Ламашэвіч** склалі пратакол, які чакаў яе вяртання ў родны горад. Пасля шэсця Недармаедаў у Гародні Галіна Ламашэвіч ад'язджала да сваякоў. Але як толькі яна вярнулася да яе да хаты завіталі міліцыянты з пратаколам. Падпісваць яго удзельніца акцыі адмовілася. Міліцыянты паведамілі ёй, што суд адбудзецца на гэтым тыдні.

Усяго ў Гародні складзена больш за 10 пратаколаў адміністрацыйных правапарушэнняў за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве. Улады таксама адмовілі ў правядзенні мітынгу за адмену Дэкрэту №3, які планавалася правесці 15 сакавіка. Паводле кіраўніка філіі БНФ Вадзіма Саранчукова, заяўку падалі ў адпаведнасці з артыкулам 5 закону Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1997 году № 114-З «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь».

Гомель. Уладзімер Няпомняшчых – адзінаццаты ўдзельнік акцыі пратэсту супраць Дэкрэту №3, які 6 сакавіка атрымаў па пошце адміністрацыйны пратакол, складзены на падставе артыкула 23.34 КаАП. Падобныя пратаколы раней атрымалі праз пошту **Леанід Судаленка, Уладзімер Кацора, Віктар Рубцоў, Васіль Палякоў, Барыс Анікееў, Мікалай Пяшко, Андрэй Макараў,** блогеры **Максім Філіповіч і Дзмітрый Сабураў** ды некаторыя іншыя ўдзельнікі маршу.

Орша. 6 сакавіка падчас ператрусу ў прыватным доме № 13 па вуліцы Чырвонаармейскай, дзе збіраліся мясцовыя актывісты, супрацоўнікі міліцыі правялі ператрус – па падазрэнні ў друкаванні фальшывых грошай. Ператрус працягваўся гадзіны паўтары. Праглядалі ўважліва ўсе рэчы, але з сабой забралі на праверку выключна аргтэхніку. Журналіст **Ігар Казмерчак** прычыну ператрусу бачыць у тым, што 12-га сакавіка ў Воршы плануецца правесці «Марш недармаедаў», звесткі пра які былі размешчаны на сайце orsha.eu, які рэдагуе Казмерчак.

Пінск. Пракуратура Пінскага раёна вынесла пісьмовае папярэджанне грамадскаму актывісту **Дзмітрыю Сергіевічу** толькі за тое, што на сваёй старонцы Укантакце паведаміў пра дзень і час Марша недармаедаў у Пінску. Гэта стала падставай палічыць Сергіевіча арганізатарам будучай акцыі. Блогеру далі зразумець, што ягоны выхад на акцыю абыдзецца яму ад 20 да 40 базавых велічынь штрафу або адміністрацыйным арыштам.

Пратаколы адміністрацыйных правапарушэнняў складзеныя таксама на ўдзельнікаў акцый пратэсту супраць Дэкрэта №3 з Магілёва, Віцебска, Баранавіч і Бярозы.

Па ўсёй Беларусі ідэолагі і прадстаўнікі вертыкалі наведваюць прадпрыемствы і навучальныя ўстановы, папярэджваюць аб наступстваў удзелу ў маршах пратэсту аж да звальнення і выключэння са студэнтаў.

Твитнуть



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля райда па санэтках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY